

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 7 (278) ● 5 чэрвеня 2000 года, панядзелак

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


## УРАЧЫСТЫ СХОД ВЕТЭРАНАЎ

Напярэдадні Дня Перамогі адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 55-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У актавай зале сабраліся ветэраны вайны і працы, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, студэнты. З дакладам выступіў першы прарэктар па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях І.П. Мартынаў.

Удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, партызанам і прыроўненым да іх ветэранам былі ўручаны падарункі, у сувязі з 55-й гадавінай Перамогі адміністрацыя выдаткавала таксама сродкі на грашовую дапамогу і святочны стол.

Упершыню на ўрачыстасцях прагучаў верш І.П. Мартынава, прысвечаны Дню Перамогі, які мы і прапануоўваем чытачам.

❁ ❁ ❁

**Иван МАРТЫНОВ**

О, Родина моя!
Нам нет дороже даты,
Чем этот светлый день весны!
Прославили тебя твои сыны -
солдаты
В четыре года той войны.

Когда жестокий враг,
напав на землю нашу,
Навязывал порядок свой,
Ты, Родина моя,
испив страданий чашу,
Осталась с гордой головой.

Тебя не устрашили виселицы,
казни,
Развязанный врагом террор.
Сыны и дочери твои -
все без боязни
За честь твою шли на костер.

В горниле страшных дней
потерян каждый третий
Из жителей моей страны.
В веках им слава всем!

Пусть через цепь столетий
Услышат эхо той войны.

Не видел раньше мир
подобных разрушений,
С детьми сожженных
деревень...
По праву после всех
невиданных сражений
Настал святой Победы день!

О тех, кто пал тогда,
колокола Хатыни
Напомнят. Хрупка жизни нить...
И, чтоб края отцов
не превратить в пустыни,
Нам нужно вечно
мир хранить.

О тех, кто выстоял,
кто встретил день Победы,
Пусть длится память
навсегда.
Пусть знают правнуки,
какими были деды

В те архитрудные года...

Теперь их головы
украсили седины,
И сил уж прежних нет в руках.
Но духом все они,
как и тогда, едины,
Их подвиг не умрет в веках.

Любовью к Родине,
духовной чистотою,
И братством фронтовым
сильны.
К Победе шли они
с надеждою святою -
Отчизны верные сыны.

Они уберегли
от злой чумы планету,
За что им всем
земной поклон.
Чтоб не прервалась
связь времен,
Мы будем помнить все
Великую Победу!

## ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ

7 мая універсітэт гасцінна адкрыў дзверы для абітурыентаў і іх бацькоў: праводзіўся традыцыйны «Дзень адкрытых дзвярэй». На гэты раз сабраліся больш за 500 чалавек, у асноўным - іншагародніх. На пытанні абітурыентаў і іх бацькоў адказвалі старшыня прыёмнай камісіі, рэктар, прафесар С.А. Маскевіч, першы прарэктар Я.А. Роўба, адказны сакратар і намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі, дэканы і намеснікі дэканаў усіх факультэтаў.

Пытанняў у абітурыентаў было, як заўсёды, шмат: чым адрозніваюцца, напрыклад, правілы прыёму ад мінулагодніх, які парадак правядзення экзаменаў, удзелу ў конкурсе, хто можа паступаць па-за конкурсам і г.д. Цікавіліся абітурыенты і іх бацькі і факультэтамі, асобнымі спецыяльнасцямі, дэталямі навучання і ўнутранага распарадку універсітэцкага жыцця. На гэтыя пытанні дапамог адказаць новы відэафільм аб факультэтах, створаны сіламі універсітэцкага творчага аб'яднання «Ракурс», які прысутныя глядзелі з вялікай цікавасцю.

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Рэктарат, прафком, савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

❁ 3 чэрвеня - **Івана Міхайлавіча СЦЯПУРУ** - дацэнта кафедры АГ і МВМ.

❁ 6 чэрвеня - **Ларысу Аляксандраўну ЛЯНКОВУ** - выкладчыка кафедры замежных моў.

❁ 9 чэрвеня - **Галіну Мікалаеўну КОЎШЫК** - прыбіральшчыцу інтэрната №3.

❁ 16 чэрвеня - **Ядзвігу Уладзіслаўну ВАСІЛЕЎСКУЮ** - повара камбіната грамадскага харчавання.

❁ 20 чэрвеня - **Вольгу Аляксандраўну МІТРОШЫНУ** - лабаранта І катэгорыі кафедры спартыўнай медыцыны.

❁ 24 чэрвеня - **Людмілу Еўсцігнееўну РУСАНАВУ** - старшага выкладчыка кафедры тэорыі і методыкі фізкультуры.

❁ 28 чэрвеня - **Наталлю Аляксееўну МАНАШЫРАВУ** - прыбіральшчыцу навучальнага корпуса №3.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***«Да умножится яко дождь навчение мое».***

***Франциск СКОРИНА.***

## ФОТАРЭПАРТАЖ З РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ

# АДЗНАКУ ПАСТАВІЦЬ ФЕМІДА



Гэтага дня чакалі, да яго рыхтаваліся. І ўсё ж прыйшоў ён неяк нават нечакана - дзень Рэспубліканскай алімпіяды студэнтаў-юрыстаў. Хваляваліся. Нашаму юрыдычнаму факультэту давялося сустракаць удзельнікаў, планаваць увесь ход Рэспубліканскай алімпіяды.

- Такога вопыту не было, - гаворыць загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Мікалай Уладзіміравіч Сільчанка. Апошняя алімпіяда сярод студэнтаў-юрыстаў праводзілася ў рэспубліцы пятнаццаць гадоў таму. Але ж некаму трэба пачынаць. Выбар выпаў на нас, і мы, я мяркую, з годнасцю выканаем гэтую задачу, праўдзем алімпіяду...

Заданні алімпіяды былі даволі сур'ёзныя - па 6 дысцыплінах трэба было выканаць работу пісьмова. У першы дзень удзельнікі алімпіяды рашалі заданні па агульнай тэорыі права, канстытуцыйнаму праву, адміністрацыйнаму праву. На наступны дзень - па грамадзянскаму праву, па крымінальнаму праву і па крымінальнаму працэсу.

Работы правяралі нашы выкладчыкі, адзнакі выводзіліся па 10-бальнай сістэме.



Сем каманд з розных куткоў Беларусі прыехалі ў Гродна, каб паспрабаваць свае сілы і веды. Акрамя каманд ГрДУ, БДУ, Брэсцкага, Гомельскага і Полацкага дзяржаўных універсітэтаў, у алімпіядзе прынялі ўдзел каманды Беларускага недзяржаўнага інстытута правазнаўства з Мінска і яго Гродзенскага філіяла.

У перапынку мы папрасілі гасцей алімпіяды падзяліцца сваімі думкамі наконт яе арганізацыі.

**Аляўціна Блінова**, студэнтка 4 курса Полацкага дзяржаўнага універсітэта:

- Вельмі добра, што мы змаглі сустрэцца, пазнаёміцца. Арганізавалі ўсё выдатна. Якое б месца мы ні занялі, усё роўна варта было прыехаць...

**Ягор Жданаў**, студэнт 4 курса Полацкага дзяржаўнага універсітэта:

- У вас так усё спадабалася - і выкладчыкі, і студэнты добразычлівыя, шчырыя. Мы пасябравалі з іншагароднімі студэнтамі - будучымі юрыстамі, абмяняліся думкамі наконт будучыні. Ну і, вядома, цікава параўнаць свае веды з ведамі студэнтаў з іншых ВНУ. Такія сустрэчы патрэбны. Дзякуй арганізатарам, дзякуй гродзенцам!



Скончыўся перапынак, і ўдзельнікі алімпіяды занялі свае месцы ў 108 аўдыторыі. Прафесар М.У. Сільчанка зачытаў вынікі, назваў суму балаў кожнай каманды. Прыемна было ўсведамляць, што нашы не падвялі. Першае месца заняла каманда Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, другое - каманда Гродзенскага філіяла недзяржаўнага інстытута правазнаўства і трэцяе - каманда Полацкага дзяржаўнага універсітэта.

І пераможцы, і тыя, хто не стаў лідэрам, разыходзіліся ў добрым настроі (акрамя, бадай, каманды БДУ, якая не хацела прымірыцца з паражэннем і выказвала сваё незадавальненне не зусім прыгожа). Кожны разумеў, што алімпіяда - гэта толькі гульня, чарговае выпрабаванне. А канчатковую адзнаку паставіць жыццё.





**На здымках: рабочыя моманты алімпіяды; члены каманды-пераможцы, студэнты 3 курса юрыдычнага факультэта ГрДУ Дзяніс САФАРЭВІЧ, Таццяна БАБКОВА, Алеся ГАЎРЫЛІК, Аляксей ЖУК.**

**Людміла ДАНІЛАВА, Ігар ЯРАШЭВІЧ (фота).**

# ПОВЫШАЕМ КВАЛИФИКАЦИЮ



Институт повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов, созданный при университете несколько лет назад, уже завоевал прочный авторитет в регионе как учебное заведение, в котором можно получить полезные современные знания и повысить квалификацию.

Ежегодно здесь получают дополнительные знания по разным направлениям люди самых различных специальностей и возрастов. Например, переподготовку проходят учителя средних школ нашей области, преподаватели колледжей, методисты и представители других профессий системы народного образования. И не только. Уже в самом названии института заложен смысл его деятельности. Преподаватели проводят занятия по изучению иностранных языков, бухгалтерского дела, компьютера и т.д.

Большой популярностью пользуются курсы, которые позволяют слушателям при-





обрести современные знания и навыки в сфере экономики, менеджмента, бухгалтерии.

Институт повышения квалификации уже сделал много полезного и для университета, так как повышение уровня знаний сотрудников ВУЗа здесь осуществляется бесплатно. К примеру, в мае закончилась подготовка пользователей ПК по 30-часовой программе. Компьютерную грамоту изучали 24 человека из числа сотрудников и преподавателей университета.

**На снимках: занятия по программе компьютерного обучения ведет инженер-программист ВЦ В.В.ГАЛУШКИН; исторический момент: у «курсантов» кое-что уже получается!**

**Фото Игоря ЯРОШЕВИЧА.**

# ХТО ЁСЦЬ ХТО

Нядаўна ў Мінску пабачыла свет энцыклапедыя «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь. Людзі Справы» (на рускай мове). Кніга вялікага фармату, з залацістым загалоўкам на вокладцы, аб'ёмам у 57 улікова-выдавецкіх аркушаў. Асобы, змешчаныя ў гэтай кнізе, былі рэкамендаваныя грамадскім саветам энцыклапедыі, які складаецца з 9 чалавек. Сярод іх - былы прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі М.А. Барысевіч.

У анатацыі сказана, што энцыклапедыя утрымлівае інфармацыю пра дзеячаў навукі, культуры, мастацтва, адукацыі, аховы здароўя, бізнесу, якія дамагліся значных прафесійных і творчых поспехаў, унеслі свой уклад у развіццё дзяржавы. У невялікіх артыкулах, прысвечаных пэўнаму дзеячу, даюцца біяграфічныя звесткі, называюцца пасады, навуковыя званні, адзначаецца ўдзел у грамадскіх арганізацыях, асацыяцыях, пералічваюцца асноўныя дасягненні.

У бібліятэцы нашага універсітэта пакуль што няма гэтай кнігі. Дарэчы, выдадзена яна параўнальна невялікім тыражом - 1000 экзэмпляраў. Я трымала ў руках гэтую кнігу і пацікавілася, хто ж з нашых выкладчыкаў трапіў у энцыклапедыю.

У раздзеле «Адукацыя» чамусьці не аказалася нікога з універсітэцкіх спецыялістаў. А ў раздзеле «Навука» ёсць пяць чалавек з універсітэта. Хочацца назваць іх паіменна.

**КАРДАБНЁЎ Анатоль Анатольевіч** - кандыдат педагагічных навук, дацэнт, гісторык, педагог-даследчык. Дырэктар Фонду педагагічных ініцыятыў, прэзідэнт клуба аўтарскай песні «Панарама». Стварыў эксперыментальны летні лагер «Фламінга», газету «Цінінфо», арганізаваў фестываль аўтарскай песні «Зялёны Гран Пры», апублікаваў 37 навукова-метадычных прац.

**КІРВЕЛЬ Часлаў Станіслававіч** - загадчык кафедры філасофіі, доктар філасофскіх навук, прафесар. Удзельнічаў у рабоце філасофскага таварыства Расіі і Беларусі. Аўтар многіх артыкулаў, манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. Выступіў ініцыятарам і арганізатарам шэрагу міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый па актуальных праблемах сацыяльнай філасофіі.

**ЛЕПЕШАЎ Іван Якаўлевіч** - прафесар кафедры беларускай мовы, доктар філалагічных навук (1985), прафесар (1987). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі» і інш., знакам «Выдатнік народнай асветы». Аўтар 213 навуковых і навукова-метадычных прац, у тым ліку 20 кніг, сярод іх манаграфіі, слоўнікі, вучэбныя дапаможнікі.

**МІЛІНКЕВІЧ Аляксандр Уладзіміравіч** - кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт. За адкрыццё месца пахавання апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага ўзнагароджаны ордэнам «За заслугі перад польскай культурай» (1989); лаўрэат прэміі Незалежнага фонду «Полькуль» (Аўстралія). Член Беларускага Хельсінскага камітэта. Аўтар больш за 60 навуковых прац па квантавай электроніцы, лазернай тэхніцы, гісторыі культуры адукацыі, архітэктуры і тэхніцы.

**РАЗЕНФЕЛЬД Усер Давыдавіч** - загадчык кафедры культуралогіі, дырэктар Інстытута сацыяльна-гуманітарных навук, доктар філасофскіх навук, правадзейны член Міжнароднай акадэміі па вывучэнні нацыянальных меншасцяў, член інтэрнацыянальнага цэнтра універсітэцкіх выкладчыкаў яўрэйскай цывілізацыі (Ерусалімскі універсітэт, Ізраіль), выдатнік народнай асветы Беларусі. Узнагароджаны ганаровымі граматамі Міністэрстваў адукацыі СССР і Беларусі, медалём «За доблесную працу». Аўтар шматлікіх навуковых і навукова-метадычных прац у галіне філасофіі.

Звесткі яшчэ пра двух чалавек з універсітэта змешчаны адпаведна ў раздзелах «Культура і мастацтва», «Ахова здароўя».

**ДАНІЛАВА Людміла Мікалаеўна** - журналістка, рэдактар газеты «Гродзенскі універсітэт». Лаўрэат прэміі (1-е месца) Алтайскай краявой арганізацыі Саюза журналістаў СССР (1985). Член Саюза журналістаў Беларусі. Удзельніца фестывалю творчай моладзі Казахстана (1988), удзельніца форуму журналістаў краін СНД (1998).

**МЕЛЯШЭВІЧ Аляксей Уладзіміравіч** - хірург, урач-лячэбнік, доктар медыцынскіх навук (1990), прафесар (1991), загадчык кафедры асноў медыцынскіх ведаў. У дыягностыцы ім распрацавана некалькі метадаў і прыёмаў. Вызначыў 2 навуковыя напрамкі, звязаныя з гнойнымі захворваннямі скуры, а таксама з траўмамі селязёнкі, нырак, печані... Аўтар звыш 100 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій, 11 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва, 2-х патэнтаў.

Віншуем нашых калег!

**М. ЯКАЛЦЭВІЧ,**
**дацэнт кафедры беларускай мовы.**

# НЕПАЎТОРНЫЯ ІМГНЕННІ

## КРОКІ ДА САМАСЦВЯРДЖЭННЯ

**Ужо ў другі раз запар пашчасціла нам ( і выкладчыкам, і студэнтам беларускага аддзялення філалагічнага факультэта пятага курса) пабываць, хоць і нядоўга (няпоўныя два месяцы) у шматпрофільным ліцэі №1 пры ГрДУ імя Янкі Купалы. Вельмі спадзяваліся, што і ў гэтым годзе хоць каму-небудзь пашчасціць папрацаваць у беларускім гуманітарным класе, дзе ўсе дысцыпліны вядуцца на матчынай мове. Але жаданаму не суджана было збыцца. Мінулагодні астравок матчынай мовы і культуры прытапіўся (як гэта не цяжка ўспрымаць) пад «ціскам» шэрагу прычын і абставін. Не атрымалася ў гэтым годзе зрабіць набор ліцэістаў у беларускія класы. І няма ў гэтым віны дырэктара ліцэя Андрэя Пятровіча Панцэвіча, які ў шчырай размове не апраўдваўся, што не ўдалося практычна ўвасобіць у жыццё задуманае, а агаварыўся, што час - лепшы настаўнік, які ўсё расставіць на свае месцы. Будзем спадзявацца і не будзем загадзя складваць рукі, бо падстаў для сумнага настрою і песімізму няма, бо апынуліся нашыя выхаванцы амаль што ў роднай сям'і, сярод сваіх старэйшых калег, вопытных, даравітых, улюблёных у сваю справу настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры: Мікалая Іванавіча Белуша, Вольгі Львоўны Несцяровіч, Наталлі Васільеўны Булай, Святланы Вацлаваўны Савашынскай, з якімі не сталіся, не расчараваліся, не спалохаліся, а, наадварот, хоць на імгненне, на невялікі прамежак часу расправілі крылы для самастойнага палёту па жыцці, палёту творчага, мудрага, шчаслівага.**

**Пра іх першыя імгненні самастойнасці і першыя крокі да самасцвярджэння гавораць яны самі і іх старэйшыя калегі...**

**Пятро МАЛЯЎКА,**
**групавы кіраўнік практыкі па беларускай мове і літаратуры ў ліцэі №1 г.Гродна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

## РАДАСЦЬ СУСТРЭЧ

**Наталля БУЛАЙ,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры ліцэя №1**

Традыцыйнымі сталі сустрэчы ў ліцэі №1 г. Гродна настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры з выкладчыкамі універсітэта і студэнтамі аддзялення беларускай і славянскай філалогіі. Прыемна адчуваць, што ў такі складаны час ёсць «героі», для якіх абраная прафесія моваведа стане сэнсам іх далейшага жыцця. Мы рады, што маладыя настаўнікі-філолагі папоўняць нашу педагагічную сям'ю.

Нам, настаўнікам ліцэя, не так лёгка працаваць з вучнямі «залатога запасу», калі прыходзіцца кожны дзень папаўняць свой навуковы, маральны і культурны патэнцыял і зноў яго аддаваць. Вучні нашы вылучаюцца сваім інтэлектам: смела ўступаюць у гутарку і вядуць дыскусію, даюць ацэнку падзеям, крытычна ставяцца да той ці іншай сітуацыі; згаджаюцца ці не са словам настаўніка, аўтара твора ці даследчыка.

У час педагагічнай практыкі студэнты-філолагі прайшлі праз выпрабаванні не толькі як настаўнікі, але як выхавальнікі, псіхолагі, суразмоўцы. Менавіта ў цесным кантакце з дарослымі вучнямі адлюстроўваюцца светапогляд і культура будучых настаўнікаў, узровень іх разумовага развіцця, памкненні, погляды, грамадзянскія ідэалы.

Той прамежак часу, праведзены студэнтамі ў сценах ліцэя, даў магчымасць яшчэ раз зірнуць на сябе збоку, упэўніцца ў сваіх сілах, адчуць, што цябе чакаюць і ты патрэбны для таго, каб «сеяць разумнае, добрае, вечнае».

Поспехаў вам, будучыя педагогі, у здачы дзяржаўных экзаменаў!

## АБ СВАІМ, РОДНЫМ...

**Мікалай БЕЛУШ,**
**настаўнік школы-ліцэя №1.**

На працягу некалькіх гадоў студэнты філалагічнага профілю універсітэта праходзяць педагагічную практыку ў сценах ліцэя. Тут выпрабоўваецца іх гарт як настаўнікаў. І сапраўды, кожнаму з нас успамінаюцца першыя ўрокі, удалыя і не зусім, хваляванні і трывогі, надзеі і расчараванні. Ды і вучні вылучаюцца сваёй адметнасцю: умеюць смела весці дыскусію, асэнсоўваць і ўзважваць думкі настаўнікаў, даследчыкаў, крытычна ацэньваць сітуацыю.

Мы вельмі спадзяемся, час практыкі быў карысны і плённы для будучых педагогаў, паколькі набыта нямала практычных навыкаў, выпрацавана структура розных урокаў, кожны адчуў сваё «я».

Поспехаў вам, маладыя калегі, на ніве педагагічнай думкі і навукі!

## ПЕРШАЯ ПРЫСТУПКА

**Ірына СУЦЬКО,**
**студэнтка 5 курса**

Я ўдзячна лёсу, што мне давялося праходзіць практыку менавіта ў ліцэі №1, менавіта пад кіраўніцтвам Вольгі Львоўны Несцяровіч, менавіта ў 10 хімікабіялагічным класе. «Мае» дзеці - вучні розных школ вобласці, ды і самі яны ўсе розныя. Але іх аб'ядноўвае зацікаўленасць у выніках сваёй вучобы. Відаць, таму і мне было лёгка і цікава з імі працаваць. Іх дапытлівасць і кемлівасць у пытаннях беларускай мовы і літаратуры не можа не радаваць, улічваючы тое, што большая колькасць гадзін разлічана на вывучэнне хіміі і біялогіі.

Я спадзяюся, што жыццё яшчэ не раз падорыць мне сустрэчы з такімі настаўнікамі і такімі вучнямі.

А прысвячэнне ў настаўнікі для мяне ўжо адбылося...

## ЛЮБІЦЬ МАТЧЫНУ МОВУ

**Ларыса РАДЗЮН,**
**студэнтка 5 курса**

Цяпер, пасля заканчэння практыкі, я з радасцю магу адзначыць, што мае дрэнныя прадчуванні не спраўдзіліся. І дзякуй за гэта трэба сказаць перш за ўсё нашаму кіраўніку - Пятру Іванавічу Маляўку. Ён не прад'яўляў да нас, студэнтаў, нейкіх «звышпатрабаванняў» і, паколькі гэта было магчыма і карысна для нас, даваў «свабоду дзеянняў». Таксама дапамаглі мне асвоіцца і настаўнікі: класны кіраўнік Людміла Дзмітрыеўна Рашчупкіна і настаўнік-метадыст Святлана Вацлаваўна Савашынская. Я трапіла ў цудоўны клас - 11 філалагічны.

Ужо на першым тыдні практыкі я пазнаёмілася з вучнямі гэтага класа. Яны больш сур'ёзна ставяцца да навучання, большасць з іх ужо мае пэўную мэту ў жыцці: атрымаць вышэйшую адукацыю. Але здаралася, што, падпарадкоўваючыся адвечнай чалавечай ляноце, яны маглі не падрыхтавацца да ўрока. І не адзін-два вучні, а ўвесь клас! Маглі яны арганізаваць і іншыя «сюрпрызы» настаўніку. І я, студэнтка-практыкантка, наўрад ці справілася б з такімі сітуацыямі, калі б не дапамога настаўніка-метадыста С.В. Савашынскай. З ёю я працавала амаль два месяцы не проста побач, а разам. Святлана Вацлаваўна - добры настаўнік і цудоўны чалавек. Я магла падчас практыкі звярнуцца да яе з любымі пытаннямі, праблемамі і заўсёды ведала, што атрымаю добрую параду. Я вельмі ўдзячная за яе стаўленне да мяне не як да чарговай практыканткі, а як да сваёй калегі, якая пакуль што не мае вопыту. Абмеркаванне ўрокаў ніколі не было фармальным указаннем на мае памылкі: «няправільна тое і тое». Так, Святлана Вацлаваўна давала пэўныя заўвагі, але яны былі ў форме «так, у прынцыпе, добра, але можна было б зрабіць лепш». І тлумачэнне на будучае, як - лепш. І гутарыць мы маглі не толькі аб уроках, але і на іншыя, жыццёвыя тэмы.

Менавіта яна дапамагла мне канчаткова ўпэўніцца ў правільнасці выбару жыццёвага шляху - стаць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры.

Зразумела, не ўсё было лёгка, проста і добра падчас практыкі. Асабіста мяне, да прыкладу, засмучалі і ўражвалі адносіны вучняў, ды і многіх настаўнікаў, да беларускай мовы.

На ўроках многія не маглі размаўляць па-беларуску: не хапала слоў. А гэта значыць, што роднай мовай яны не валодаюць. І, відаць, усё, што я асабіста змагу зрабіць як настаўніца беларускай мовы і літаратуры у не такой ужо далёкай будучыні, - гэта выхоўваць у дзяцей павагу і любоў да роднай мовы і літаратуры.

# БЛІЖЭЙ ДА ПРАФЕСІІ

**Алена ПЛЮТА,**
**студэнтка 5 курса**

Спачатку я не ведала, што ў ліцэі №1 толькі 10-я і 11-я класы. І калі настаўніца ліцэя Н.В. Булай паведаміла, што я буду весці ўрокі ў 11 «ЭК-2» класе, мяне ахапіў жах.

Не шкадую аб тым, што жыццё пазнаёміла мяне з настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Наталляй Васільеўнай Булай. Вучні яе паважаюць, заўсёды актыўныя на ўроках, дысцыплінаваныя. Яна ніколі не павысіць на іх голасу, нягледзячы на тое, што даволі строгая і дастаткова патрабавальная настаўніца.

Хочацца расказаць пра першую сустрэчу з вучнямі 11 «ЭК-2» класа. Настаўніца мяне прадставіла ім, сказала, што на працягу двух месяцаў я буду выкладаць у іх беларускую мову і літаратуру, прапанавала папрысутнічаць на ўроку. Адна дзяўчына адразу дала мне «параду»: «Толькі двоек не стаўце, а то практыкантка па хіміі ставіла». Я адказала, што буду аб'ектыўна ацэньваць веды і ставіць тую адзнаку, якую заслужылі.

Калі пачаўся ўрок, я села за апошняй партай і пачала заўважаць пільныя позіркі вучняў у свой бок. Хлопцы, якія сядзелі перада мною, ціха запыталі: «А чаму мы павінны вас называць Аленай Іосіфаўнай? Вы ж, напэўна, старэйшая за нас усяго на некалькі гадоў». Шчыра кажучы, мне гэта не спадабалася. Я лічу, што заўсёды павінна быць павага да настаўніка, адчувацца пэўная дыстанцыя «вучань - настаўнік», нягледзячы на тое, ці гэта маладая настаўніца, ці настаўніца з багатым вопытам працы.

Амаль увесь тыдзень мае думкі поўніліся сумненняў і адказаў на пытанні: «Як знайсці належны кантакт з вучнямі? Што неабходна дзеля таго, каб яны ўспрынялі мяне як настаўніцу, як асобу?».

Гэта праблема вырашылася сама па сабе. Калі я сама пачала весці ўрокі, вучні заўсёды актыўна працавалі, прыслухоўваліся да маіх парадаў і заўваг. Больш удалымі былі тыя ўрокі, дзе мы вырашалі праблемныя пытанні, якія хвалююць вучняў у 17-гадовым узросце: пошукі чалавекам свайго месца ў жыцці, маральныя каштоўнасці чалавека, праблемы кахання і здрады і інш. На такіх уроках узнікала палеміка паміж вучнямі, яны з годнасцю выказвалі свае думкі, аргументавалі свае погляды.

Правяраючы пісьмовыя адказы вучняў на прапанаваныя пытанні, я ўбачыла не спісванне крытычных заўваг з падручнікаў, а ў большасці выпадкаў - уласныя думкі вучняў, уласнае разуменне той ці іншай праблемы.

# МАЦУЕМ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Вольга НЕСЦЯРОВІЧ,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры ліцэя №1**

Як хутка бяжыць час... Здаецца, толькі ўчора прыйшлі да нас студэнты ГрДУ на практыку ўпершыню, а ўжо, аказваецца, заканчваецца чарговая, чацвёртая, педпрактыка. І разам з гэтым можна гаварыць пра пачатак - пачатак жыцця традыцыі супрацоўніцтва: ліцэісты-студэнты-настаўнікі.

У адным з 10-х класаў хіміка-біялагічнага профілю практыку праходзіла І. Суцько. Самыя цёплыя словы хочацца сказаць пра Ірыну Іванаўну. У ёй я ўбачыла ўдумлівага настаўніка, неабыякавага да якасці ведаў і лёсу сваіх выхаванцаў.

Педпрактыка - выпрабаванне не толькі для студэнтаў, але і іспыт для нас - настаўнікаў. Наша папярэдняя работа з вучнямі знаходзіць сваё адлюстраванне на ўроку студэнта-практыканта. А ад таго, якімі сёння будуць урокі роднай мовы і літаратуры, залежыць наша будучыня.

Для таго, каб работа была эфектыўнай, каб зрабіць вучняў зацікаўленымі саўдзельнікамі навучальнага працэсу, ад настаўніка патрабуецца творчы падыход да дзейнасці. Мы ў першую чаргу адказваем за выхаванне будучага пакалення, за фарміраванне духоўных каштоўнасцей, інтэлектуальны ўзровень нашых выпускнікоў. Трэба вучыць іх любіць і шанаваць роднае слова, ганарыцца беларускай кнігай.

Сёння ж вялікую трывогу і заклапочанасць выклікае тое, што падрастаючае пакаленне мала чытае. Кнігу, на жаль, замяняюць лёгкадаступныя перадачы тэлебачання, відэа. Але вучыцца можна толькі на творах класікаў, таму што менавіта яны валодаюць энергіяй жывой народнай маралі, заснаванай на агульначалавечых каштоўнасцях.

# СПОВЕДЗЬ БУДУЧАГА НАСТАЎНІКА

**Ягор СЦЕПАНЕНКА,**
**студэнт 5 курса філалагічнага факультэта**

Ідучы ў ліцэй №1, хацелася нават павярнуць назад, дадому, але нязломны дух перамогі накіроўваў мяне да пастаўленай мэты. А мэта мая - даць урокі беларускай мовы і літаратуры найлепшым чынам.

З кожным урокам набіраўся моцы, і здавалася, што цяпер змог бы пацягацца з настаўнікамі-філолагамі ліцэя. Канешне, гэта жарт, мне да іх яшчэ далёка. Але лічу, што час возьме сваё, і я стану дырэктарам школы, а можа, міністрам адукацыі.

Кожны раз на працу мяне натхняла тая атмасфера, якая панавала ў ліцэі: добразычлівасці і павагі да людзей. Хацелася б адзначыць настаўніка М.І. Белуша, які быў добрым дарадцам у маёй працы.

Першы крок зроблены. Цяпер мне нішто не перашкодзіць стаць вялікім настаўнікам.

# МАЕ ЎРАЖАННІ АД ПЕДПРАКТЫКІ

**Наталля МІХАЛЬЧЫК,**
**студэнтка 5 курса**

Пасля першага тыдня знаёмства з класам я ведала, што буду працаваць з сур'ёзнымі, разумнымі, сціплымі юнакамі і дзяўчатамі. З першых урокаў паміж намі ўсталяваліся адносіны ўзаемаразумення, супрацоўніцтва. Я заўсёды адчувала павагу да сябе з іх боку як да настаўніка, і ў той жа час невялікая розніца ва ўзросце спрыяла замацаванню паміж намі сяброўскіх адносін.

У мінулым годзе некалькі тыдняў я працавала ў 11 класе школы №24, і трэба сказаць, што вучні ў ліцэі адрозніваюцца большай зацікаўленасцю ў выніках сваёй працы, імкнуцца даведацца нешта новае, чуйна рэагуюць на свежыя, арыгінальныя думкі, а адпаведна ўзровень аналітычных здольнасцей у іх значна вышэйшы.

Пэўная заслуга ў гэтым настаўнікаў ліцэя, якія ў першую чаргу імкнуцца выхаваць духоўна багатых і інтэлектуальна развітых асоб.

Але галоўны стымул да вучобы ў тым, што большасць вучняў ліцэя арыентавана на паступленне ў ВНУ.

Што датычыць асабістых уражанняў ад супрацоўніцтва з класам, то ў першую чаргу хочацца сказаць пра тое маральнае і прафесійнае задавальненне, якое адчуваеш, калі ўдаецца так арганізаваць працу на ўроку, каб вучні самастойна прыходзілі да пэўных высноў, каб выказвалі свае арыгінальныя думкі, няхай нават і няправільныя.

І я лічу лепшымі тыя свае ўрокі, калі такія эксперыменты атрымліваліся, бо адна справа, калі вучні пасіўна ўспрымаюць інфармацыю ад настаўніка, а іншая - калі да ісціны яны прыходзяць шляхам разважанняў і спрэчак.

Яшчэ прыемна тое, што не марна была праведзена літаратурная гасцёўня, прысвечаная сустрэчы з маладымі паэтамі.

Яшчэ раз хочацца сказаць шчыры дзякуй майму настаўніку-метадысту М.І. Белушу, які даваў шмат слушных метадычных парад, дапамагаў наладзіць кантакт з класам, справядліва ўказваў на недахопы і ацэньваў дасягненні - усё гэта было несумненным стымулам да ўдасканалення і пошукаў новага.

# ПАМЯТИ ТОВАРИЩА

## Анатолию Мироновичу ШИШКО

**Иван МАРТЫНОВ**

Тяжелые минуты
расставания...
Достойно завершил
земной свой путь
Носитель гордый
воинского звания -
Не мог он дело делать
как-нибудь.
Любить Отчизну -
так уж всей душою,
Всей жизнью подавая нам
пример.
С достоинством,
с отвагою большою
Громил врага он,
храбрый офицер.

Он командир,
он вел солдат к Победе,
Учил их верности присяге
до конца,
Учил их быть за Родину
в ответе,
Служить ей ревностно,
не требуя венца.
Он, отслужив
положенные годы,
Пришел в гражданский вуз
в расцвете лет.
Он, опытный и мудрый
от природы,
Мог дать коллегам
правильный совет.

Кто хоть однажды в жизни
его встретил,
Тот мог легко в его глазах
прочесть:
Он справедлив,
красив душой и светел,
Считал, что нам
всего дороже честь.
Он говорил
всегда неторопливо,
Слова его весомей серебра,
Душа была открыта
для добра.
Он жизнь прожил
достойно и красиво.

## ШИШКО Анатолий Миронович



**10 мая 2000 г. скоропостижно скончался старший лаборант кафедры физического воспитания Шишко Анатолий Миронович. Шишко А.М. родился 7 октября 1918 года в деревне Малевичи ныне Вилейского района Минской области. В 1941 году был призван в ряды Красной Армии. А.М. Шишко - активный участник Великой Отечественной войны, подполковник в отставке, награжден 2 орденами и 11 медалями. С 1964 года по 1972 год А.М. Шишко был комендантом главного корпуса университета, а с 1972 года до последнего дня жизни - старший лаборант кафедры физвоспитания. Был требователен к себе, пользовался авторитетом в коллективе, являлся образцом отношения к порученному делу, был честным, принципиальным, трудолюбивым, скромным, чем снискал глубокое уважение всех, кто его знал.**

**Светлая память о нашем коллеге, товарище, друге навсегда сохранится в наших сердцах.**

**ГРУППА ТОВАРИЩЕЙ.**

# ОСНОВНАЯ ПРОФЕССИЯ – ЗАЩИЩАТЬ РОДИНУ

**В один из майских дней в редакцию газеты «Гродзенскі універсітэт» поступил материал кандидата исторических наук, доцента кафедры истории Беларуси В.Е. Егорычева об участнике Великой Отечественной войны Анатолии Мироновиче Шишко. Мы собирались опубликовать этот материал под рубрикой «История в лицах». И вот Анатолия Мироновича не стало. В память о нем редакция публикует статью В.Егорычева «Основная профессия - защищать Родину» без изменений - так, словно Анатолий Миронович Шишко рядом с нами. В сердцах и в памяти тех, кто его знал, он останется добропорядочным, отзывчивым, оптимистичным, живым...**

Более четверти века знаком с этим человеком. И только благодаря последним встречам и беседам с ним узнал столько интересного и поучительного, что возникло естественное желание рассказать хотя бы вкратце о жизненном пути Анатолия Мироновича Шишко.

Немало удивился, узнав, что моему собеседнику (уже или еще?) 82 года. Ведь, глядя на полного энергии и оптимизма ветерана Великой Отечественной войны и Вооруженных Сил СССР, подполковника в отставке А.М. Шишко, этого не скажешь.

Вероятно, 1918 год, год рождения РККА, оказал воздействие на то обстоятельство, что в семье фельдшера и домохозяйки из дер. Малевичи Ильянского района Молодечненской волости появился мальчик Толя, судьбой определенный к тому, что делом всей его сознательной жизни станет армия. Впрочем, и отцу новорожденного довелось повоевать с посягнувшими на нашу землю интервентами.

Подтверждение сказанному и тот факт, что уже после окончания войны, вдоволь навоевавшийся тогда командир взвода 308 арт. полка 144-й стрелковой дивизии, не колеблясь продолжил военную службу, которая стала для Анатолия Мироновича основной профессией и святым делом. Но это после Победы, и это «мирный» период жизнедеятельности.

А до войны А.М. Шишко проживал в Казахстане, там учился и работал: директор стадиона «Казстройпуть», студент школы физкультуры ВЦСПС.

- Когда началась война, - рассказывает седовласый ветеран, - я проходил срочную службу в Казахстане. После недолгой подготовки в составе 115-й стрелковой бригады 4-го стрелкового корпуса 16-й армии под командованием Рокоссовского участвовал в боях под Москвой...

Эти декабрьские бои с фашистами Анатолий Миронович помнит до мельчайших подробностей, будто события происходили вчера. Да, это был трудный для молодых советских солдат экзамен, который они выдержали с честью.

Прошу собеседника продолжить повествование и одновременно знакомлюсь с документами и материалами гостеприимного хозяина небольшой «холостяцкой» квартиры А.М. Шишко. Газетная статья позволяет лишь тезисно обозначить боевые пути-дороги Анатолия Мироновича: зенитный батальон, артиллерийский полк, политработа среди бойцов, бои на Можайском направлении, участие в Белорусской операции, освобождение Прибалтики, Кенигсберга. Старые фронтовые фото, лица друзей и однополчан. Не все дожили до победного дня. Сам Анатолий Миронович ранен был не раз, но после лечения в госпиталях снова возвращался в строй, снова - передовая, снова - бои...

Немало у ветерана боевых наград, каждая - признание смелости, мужества, решимости в борьбе с врагом.

- Знаете, без этого мы бы не одержали победу. Защищали ведь родную землю, матерей, жен, ребятишек, любимых... Сражались, не думая о собственной жизни.

Наша беседа возвращается к послевоенной поре. Офицер-фронтовик Шишко служит в Прикарпатском военном округе на командных должностях. 1952-1953 гг. - в учебной карточке коммуниста Шишко А.М. нахожу запись: «Спецкомандировка». Анатолий Миронович поясняет - служил в ГДР (режим секретности).

А дальше - интереснейшая история о том, как бывший классный артиллерист стал одним из первых советских ракетчиков. Участие в испытаниях ракетной техники в экстремальных условиях в преддверии полета Ю.Гагарина в космос; спецоперация в ГСВГ; обеспечение боеготовности ракетного дивизиона (командир); учеба будущих мастеров ракетного дела...

При всех неожидачных поворотах в жизни современного общества герой нашего небольшого рассказа остается верен себе, своим принципам. Это отмечают его коллеги по совместной работе. «Человек, который видит проблемы сегодняшнего дня и не желает мириться с тем, что еще в жизни плохо». «Честный и правдивый человек». «Достоин полного уважения». Сколько уважения и признательности в этих словах! Спасибо, Анатолий Миронович, за то, что Вы есть, спасибо за науку жизни! С 55-летием Победы!

**Владимир ЕГОРЫЧЕВ,**
**кандидат исторических наук,**
**доцент кафедры истории**
**Беларуси.**

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

**РУБРИКУ ВЕДЕТ СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ КАФЕДРЫ ФИЗВОСПИТАНИЯ О. СМОЛЯКОВ**

## «СЕРЕБРО» ГРЕКО-РИМЛЯН

Спорткомплекс «Олимпийский» в Минске стал местом проведения соревнований по греко-римской борьбе в программе республиканских спортивных студенческих игр.

Борцы из семнадцати вузов страны три дня вели спор за командную победу и за победу в восьми весовых категориях.

Четыре первые места, две серебряных и одна бронзовая награда и общее второе место - таков итог выступления спортсменов нашего ВУЗа.

Победив всех своих соперников, на высшую ступень пьедестала почета поднялись: Владимир Власов (вес 54 кг), Борис Радкевич (вес 58 кг), Сергей Кебиков (вес 69 кг), Александр Минчук (вес 85 кг).

Проиграв в финальных поединках соперникам, «серебро» завоевали: Дмитрий Брич (вес 54 кг) и Олег Михалевич (вес 76 кг). Олег уступил всего один балл победителю открытого чемпионата Польши минчанину А.Оношко. «Бронза» у Сергея Юрчака (вес 97 кг). Шестое место у Геннадия Бесараба (вес 63 кг). Все студенты-спортсмены учатся на факультете физической культуры.

Кубок за командную победу остался у Академии физвоспитания и спорта, на втором месте - команда ГрГУ, на третьем - Гомельского университета. Готовил команду к соревнованиям старший преподаватель кафедры физвоспитания А.А. Кудель.

## ПО УЛИЦАМ ГОРОДА

В легкоатлетической эстафете по улицам нашего города, которая проводилась в 54-й раз на приз газеты «Гродненская правда», принимали участие сорок шесть команд.

Участников приветствовал, пожелав успехов, заместитель председателя Гродненского горисполкома Е. Жебрун.

В группе вузов и училища олимпийского резерва основная борьба за победу развернулась между командами УОР и командой факультета физической культуры университета.

Лучший результат показали уоровцы, пробежав 14 этапов протяженностью 7400 м за 15 мин 56 сек. «Серебро» завоевала команда факультета физической культуры, третьим призером стала вторая команда университета. Далее места заняли сельскохозяйственный институт, медицинский университет и команда филиала негосударственного института современных знаний.

Четко работала судейская коллегия, возглавляемая судьей всесоюзной категории, преподавателем кафедры физвоспитания университета Н. Курчаком.

## ПРАЗДНИК ЗДОРОВЬЯ

В конце мая на спортивных площадках университета состоялся праздник «День здоровья», посвященный Республиканскому дню физкультурника в нашем университете.

В этом празднике принимали участие команды студентов факультетов и преподаватели.

Прошли соревнования по мини-футболу, шахматам, волейболу, баскетболу, теннису, эстафетному бегу и другим видам спорта.

## КУБОК У ЮРИСТОВ

На стадионе «Неман» студенты-футболисты университета разыграли кубок по мини-футболу.

Восемь команд сборных факультетов три дня вели спор за почетный трофей.

Первые игры дали следующие результаты: физико-технический факультет - матфак - 2:1, факультет биологии и экологии - филологический - 4:2, юридический - факультет истории и культуры - 4:2 и факультет экономики и управления - гуманитарный факультет - 4:1.

В полуфинале юристы нанесли поражение биологам, а экономисты выиграли у команды физико-технического факультета.

В финал вышли юристы и экономисты.

На первых минутах юристы вышли вперед - 2:0, затем экономисты отвоевали один мяч. Первая половина игры закончилась со счетом 2:1.

Во втором тайме юристы провели еще три мяча против одного, проведенного экономистами.

В итоге - победа 5:2.

Кубок по футболу получил годичную прописку на юрфаке.

Четко работала судейская коллегия, возглавляемая гл. судьей турнира, ст. преподавателем кафедры физвоспитания Н.И. Ожогиным.

## ВЕСЕННИЙ КРОСС

В лесном массиве «Пышки» прошел весенний легкоатлетический кросс в программе спартакиады ВУЗа. Спортсменов встретила теплая, солнечная погода.

279 студентов из восьми команд факультетов приняли участие в этих соревнованиях, выступали лучшие спортсмены-студенты.

На торжественном открытии соревнований участников приветствовали первый проректор по учебно-воспитательной работе и социальным вопросам, профессор И. Мартынов, деканы, профессоры И.Крень и В. Тарантей, заведующий кафедрой физвоспитания, доцент С. Городилин.

И вот начались забеги. Девушки соревновались на дистанции 500 м, юноши - 1000 м.

Лучший результат у девушек показала Татьяна Храмова (матфак), пройдя дистанцию за 1 минуту 28,4 секунды. Рядом с ней на пьедестале стояли представительницы факультета психологии и педагогики Елена Пушко (1.31,4 сек) и Светлана Демиденко (1.31,6 сек).

Не было равных студенту филфака Юрию Юшкевичу у юношей. Он финишировал первым, опередив второго и третьего призеров, показав результат 2 мин 38,3 сек.

Вторым и третьим на финише были студенты факультета экономики и управления Илья Анисимов и Александр Маркевич.

Командную победу одержали будущие юристы (руководитель по спорту А. Кудель) - 46,6 очков. На втором месте - факультет экономики и управления - 559, 5 очка, на третьем - команда факультета психологии и педагогики - 773,5 очка. Далее идут команды: математический факультет - 917,0 очков, факультет биологии и экологии - 958,0 очков, физико-технический факультет - 963,5 очка, филологический факультет - 1105 очков и исторический факультет - 1412 очков.

Командное первенство определялось по наименьшей сумме очков.

Все победители и призеры кросса награждены грамотами и призами спортивного клуба университета.

# НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ

**Хутка празвініць апошні званок для студэнтаў. Асаблівым будзе ён для выпускных курсаў універсітэта. І заўёды ў такі час думаецца: а хто прыйдзе ім на змену, з кім прыйдзецца ў будучым вучыцца, працаваць?**

**Жыццё не церпіць пустот у такім асяроддзі, і таму ўжо сёння дакладна бачыцца аблічча тых, хто можа рэальна стаць студэнтам нашага універсітэта. Заканамерна ўзнікаюць пытанні: хто яны, якія яны? Пра што думаюць? Аб чым мараць?**

**На першае пытанне можна адказаць досыць канкрэтна - гэта навучэнцы універсітэцкага ліцэя №1 і адной са школ г.Гродна. А адказ на наступныя пытанні трэба шукаць у вершах, якія і прадстаўляюцца імі на суд чытачоў і аматараў паэзіі.**

**Святлана ТАРАСАВА,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры,**
**кіраўнік літаб'яднання «Наднёманскія галасы».**

*Алег САЛЕЙ*

### НЯМА МОЦЫ

Для радзімай старонкі
Мне жыцця не шкада
Я б за добрую справу
Усё на свеце аддаў.
За Радзіму святую
Я б трываў, колькі мог.
Варажыну ліхую
Ёй паклаў бы да ног.
Няма моцы
глядзець на распусту,
Няма моцы
хаваць сваю мэту,
Няма моцы
больш слухаць глупства,
Няма моцы
трываць усё гэта.

*Алёна КУХАРЧИК*

Опять ирония судьбы
Свела два почерка в конверте.
А если даже не судьба,
То не случайность, уж поверьте!
К чему запутанности ритм,
Стихосложения закон,
Когда в словах моих звучит
Сердец биенье в унисон.
И удивленью места нет,
Ты бесконечен, как стихия,
Бессмертна проза, но стихи
Звучат, как истины простые.
И бесконечность существа
Стирает пыль со слов забытых.
Пришла весна! И все слова
Свежи, как дождиком умыты.

*Георгий КИЗЕР*

### КАТЕ

Ночь. Темнеют дворы.
Сонные улицы ждут фонарей.
Знаю, ты тоже не спишь до поры.
Знаю, ты тоже стоишь у дверей.
Я, как и ты, пытался заснуть.
Но мысли будили меня.
Непредсказуем и труден наш путь,
Прошлому память осталась верна.
Жаркий костер полыхает в ночи.
Мрачные мысли витают вокруг.
Я позову. Постарайся, приди,
Мой дорогой ненавязчивый друг.

### НАКАНУНЕ РОЖДЕСТВА

Синью плещется асфальт
От парящих туч в ненастье -
Скоро будет снегопад,
И душа стремится к счастью

Накануне Рождества
Пожелаю всем удачи,
Счастья, радости, добра,
А привычных дней - поярче.
Пусть зажгутся огоньки
В уголочках глаз счастливых.
И напишутся стихи
Для единственных и милых!

Вы чуеце, як колас шэпча словы,
Што сэрца кожнае крануць гатовы,
І як плывуць па ўсім прасторы нівы
Пяшчотнай мовы пераліва?!

Лунаюць словы ў россыпах вясёлак,
У шчырых спевах звонкіх салаўёў.
Яны сатканы з сотняў яркіх зорак,
З азёраў чыстых, рэк, крыніц, лугоў.

Я чую мову ў шапаценні лесу,
Як праз вякі кліч продкаў і дзядоў.
Мне наша мова - як святая песня,
Яна кранае сэрца зноў і зноў.

Яшчэ даўно нам дадзеная Богам
Да сэрцаў беларусаў шлях знайшла.
О, мая мова! Вечны скарб народа,
Ты - краю неўміручая душа.

* * *

Усе мае думкі пра цябе, мой край,
Пра вас, з дзяцінства родныя мясціны,
Дзе сустракаю я квяцісты май,
Дзе мілы клёкат слухаю бусліны.
Усе мае думкі пра цябе, мой бор,
Мае гаі, узгоркі, далячыні,
І пра цябе, духмяны мой чабор,
Пра Нёмана сінеючыя плыні.
Усе мае думкі пра цябе, мой род.
Я кнігу памяці, гісторыі гартаю
І бачу: беларускі мой народ.
Прыносіў славу, а не здраду свайму краю.

Зямля мая! Люблю цябе такую,
Якая ёсць ты, з сумам і слязой.
І назаву цябе ласкава я: «Матуля!»
Бо ты - мая ўсмешка і мой боль.
О, Беларусь! Жыві, красуйся вечна
У вяночку з сініх-сініх васількоў.
Я за цябе пастаўлю Творцу свечку,
Каб зберагла цябе Усявышняга любоў!..

### ЗИМНЕЕ УТРО В ГРОДНО

Как будто айсберги под инеем -
Дома. Безмолвие во сне.
И в предрассветном
Свете синем
Кружится каруселью снег.
Прохожих мало,
И троллейбусы
Как будто мамонты, редки.
И все кругом - пока вполголоса:
И разговоры, и гудки.

*Ганна [illegible]ЕЎГЕНЬ*

На землю падал серый мелкий дождик.
И ветер беспощадно листья гнал.
Картину счастья создавал художник,
Любовь и верность кистью рисовал.

На полотне играли ярко краски,
Хоть был печален вечер за окном,
И образы, как из чудесной сказки,
Светили нежным, радостным огнем.

Так воплощались все мечты поэта,
Творца картины розовые сны.
Зеленых листьев шепот, золото рассвета.
Мгновение восторженной весны.

... На землю падал серый мелкий дождик,
И скоро капли превратятся в лед.
Картину новую создаст творец-художник,
Пока в его душе весна живет

*Екатерина ЗУЕВА*

### ГРИПП

Налево - грипп, направо - грипп,
Растекся липкой кашей.
Число больных, как страшный гриб,
Растет под общий кашель.
Температура тут и там,
Микроб до зверя вырос.
За мною ходит по пятам,
Облизываясь, вирус.

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.
ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ.**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 25.05.2000.*
*Падпісана да друку: 31.05.2000. 15.00*
*Заказ № 175*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас: 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.*